**ДАДАТАК 2**

# ІНСТРУКЦЫЯ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА САКРАМЭНТУ СУЖЭНСТВА Ў КАТАЛІЦКІМ КАСЦЁЛЕ І АБ ДУШПАСТЫРСТВЕ СЕМ'ЯЎ

Уводзіны

1. Касцёл заўсёды атуляў сям'ю асаблівай апекай і абараняў святасць, еднасць, плоднасць і непарыўнасць сужэнства. Вось апошнія дакументы на гэтую тэму: энцыкліка *Humanae Vitae* Папы Паўла VI (25.07.1968 г.); апостальская адгартацыя Папы Яна Паўла II *Familiaris Consortio* (22.11.1981 г.); энцыкліка *Evangelium Vitae* таго ж Папы (25.03.1995 г.); акрамя гэтага – Інструкцыя Кангрэгацыі Веравучэння *Donum vitae* (22.02.1987 г.), Статут правоў сям'і, выдадзены Апостальскай Сталіцай, шматлікія прамовы Папы, а так-сама яго «Ліст да сем 'яў», напісаны з нагоды Міжнароднага Года Сям'і (02.02.1994 г.).

Падзяляючы клопат Касцёла аб сужэнстве і сям'і, Сінод таксама лічыць сваім абавязкам выказацца па гэтай справе.

2. Падчас сінадальнай працы былі сабраны статыстычныя дадзеныя, якія сведчаць:

- аб вялікай колькасці разводаў; у вясковых раёнах на 100 зарэгістраваных шлюбаў на працягу года судамі скасоўваецца ад 30 да 60, у гарадах колькасць разводаў у параўнанні з зарэгістраванымі сужэнствамі дасягае 70-95%;
- аб зніжзнні нараджальнасці; смяротнасць перавышае нараджальнасць; колькасць абортаў у некаторых раёнах удвая большая за колькасць народзін;
- менталітэт медыкаў і грамадства, накіраваны супраць жыцця.

Да жанчыны, якая мае трое ці больш дзяцей, ставяцца так, нібы яна ўчыніла злачынства; здараецца, што працаўнікі службы здароўя аказваюць на жанчын псіхалагічны націск, прымушаючы або заахвочваючы іх да абортаў і стэрылізацыі.

3. Прааналізаваўшы гэтую сітуацыю, былі названы наступныя прычыны: страта веры і жыццё не згоднае з верай, адсутнасць або недастатковы ўзровень хрысціянскай падрыхтоўкі да сужэнства, недахоп пачуцця адказнасці сужэнцаў за сумеснае жыццё, эгаізм, алкагалізм, наркаманія, п'янства, сексуальная свабода, адсутнасць бацькі, наяўнасць у вялікай колькасці сем'яў толькі аднаго дзіцяці.

4. Каб пераадолець гэтыя цяжкасці, трэба больш увагі ўдзяляць падрыхюўцы маладых людзей да сужэнства. Гэтая падрыхтоўка распачынаецца ўжо ў сям'і. Там дзеці вучацца «шанаваць кожную сапраўдную чалавечую вартасць, кіраваць сваімі схільнасцямі і адпаведным чынам іх ужываць» (PC 66), там фарміруецца іх характар.

**Падрыхтоўка маладых пар нарачоных**
**да сакрамэнту сужэнства**

5. Падрыхтоўка да сужэнства павінна быць праведзена з усімі нарачонымі, таксама і з некатолікамі ў выпадку змешаных сужэнстваў.

Змешанае сужэнства не можа быць прычынай адмаўлення ад падрыхтоўкі. З усёй любоўю і пашанай да канкрэтных асобаў, не звязаных з Каталіцкім Касцёлам, трэба ставіць канкрэтныя патрабаванні.
У гэтай падрыхтоўцы маладых да заключэння сакрамэнту сужэнства вылучаюцца тры этапы:

- першапачатковая падрыхтоўка;
- наступная падрыхтоўка;
- непасрэдная падрыхтоўка.

Першапачагковая падрыхтоўка

6. Першапачахковая падрыхтоўка ахоплівае увесь перыяд выхавання і навучання. У рамках катэхізацыі дзяцей і моладзі пры кожнай нагодзе трэба абмяркоўваць тэмы, звязаныя з сужэнствам і сям'ёй. Некаторыя касцёльныя і дзяржаўныя святы маюць чыста сямейны змест. Трэба іх выкарыстаць, каб праз казанні і канферэнцыі выхоўваць пашану да сям'і, жанчыны, маці, да мацярынства і г.д.

Наступная падрыхтоўка

7. Наступная падрыхтоўка ахоплівае перыяд ад 16 гадоў жыцця да моманту распачацця непасрэднай падрыхтоўкі. Галоўным элементам наступнай падрыхтоўкі з'яўляецца перадшлюбны курс. Працягвацца ён не менш за 6 месяцаў. Падчас гэтай падрыхтоўкі прапануюцца наступныя тэмы:

- Божы план збаўлення;
- грэх і яго наступсгвы;
- Езус Хрыстус – Адзіны Збаўца;
- вера і Хрост як пачатак новага жыцця ў Хрысце;
- малітва;
- Божыя і касцёльныя запаведзі;
- сакрамэнт паяднання;
- Эўхарыстыя;
- сужэнства ў Божых планах;
- сужэнскае каханне;
- развіццё любові, адказнасці, прабачэння;
- мэта і заданні сям'і;
- служба жыццю і грахі супраць жыцця;
- дасужэнская і сужэнская чыстасць;
- дзеці ў сям'і і іх выхаванне;
- рэлігійнае жыццё ў сям'і;
- пагрозы і канфлікты ў сужэнстве і сям'і, іх прычыны і спосабы вырашэння;
- натуральныя метады планавання сям'і;
- літургія сакрамэнту сужэнства.

8. На заканчэнне наступнай падрыхтоўкі трэба правесці размову, каб праверыць свядомасць нарачоных аб важнасці і годнасці сакрамэнтальнага сужэнскага саюза і выдаць пасведчанне аб заканчэнні перадшлюбнага курсу (фармуляр 24).

Непасрэдная падрыхтоўка

9. Непасрэдная падрыхтоўка да сужэнства, г.зн. дашлюбная катэхізацыя, павінна праводзіцца прынамсі на працягу трох месяцаў да сакрамэнту сужэнства. Падчас гэтай падрыхтоўкі трэба нагадаць аб вартасці і сакрамэнтальнасці сужэнства, а таксама аб яго падставах. Трэба абмеркаваць і падрыхтаваць Літургію сакрамэнту сужэнства. Навучыць нарачоных натуральным метадам распазнавання плоднасці. Такія курсы праводзяць інструктары сямейнай кансультацыі, якія павінны быць у кожным дэканаце.

Для тых, хто не закончыў перадшлюбных курсаў, трэба пашырыць падрыхтоўку па тэмах, пералічаных у пункце 7.

**Душпастырства сем'яў**

10. Касцёл атуляе душпастырскай апекай сужэнствы і сем'і. Святары павінны лічыць душпастырства сем'яў адным з найважнейшых абавязкаў.

11. Душпастырства сем'яў можа мець падвойную форму: прынагодных катэхезаў і душпастырскіх мерапрыемстваў.

Навучанне

12. Душпастыры павінны выкарыстоўваць такія абставіны, як хрост, Першая Святая Камунія дзіцяці, сужэнскія і сямейныя юбілеі, адвэнтавыя і велікапосныя рэкалекцыі, а таксама святы.

Пры гэтых нагодах трэба запрашаць бацькоў на канферэнцыі, катэхезы, размовы, на якіх павінны закранацца тэмы аб актуальных праблемах сужэнскага і сямейнага жыцця. Трэба гаварыць пра цяжкасці, канфлікты, пра іх прычыны і спосабы вырашэння, пра сумесную адказнасць за еднасць у сям'і, якая дасягаецца дзякуючы размовам, шчырасці, адкрытасці, прабачэнню.

Трэба паказваць, якая вялікая сіла для прабачэння і еднасці вынікае з супольнай малітвы, сакрамэнту паяднання і супольнай Эўхарыстыі.

13. Іншая важная тэма, да якой трэба часта вяртацца, – хрысціянскае выхаванне дзяцей і ўдзел абодвух бацькоў у гэтым выхаванні.

14. Вялікае значэнне трэба надаваць супольнаму перажыванню гадавін і юбілеяў шлюбу (5, 10 гадоў.., сярэбраны, залаты юбілей) з увагі на іх выхаваўчыя вартасці.

15. Душпастырскае ўздзеянне на сям'ю – гэта справа не толькі святароў, гэта таксама сфера апостальства свецкіх. Трэба заахвочваць да гэтай дзейнасці хрысціянскіх сужэнцаў.

Дзейнасць

16. Сістэматычнае душпастырства сем’яў – гэта пастаянная духоўная фармацыя. Яна адбываецца дзякуючы рэгулярным катэхезам для дарослых, спатканням групаў ці сямейных супольнасцяў. Сёння ў каталіцкім Касцёле існуе шмат розных рухаў, таварыстваў і сямейных супольнасцяў, напр., «Хатні касцёл», «Новыя сем’і», «Рух назарэтанскіх сем’яў», «Запавет сем’яў», Апостальскі рух «Сям’я Сем’яў», Сужэнскія спатканні, Таварыства каталіцкіх сем’яў.

Сутнасць гэтых супольнасцяў заключаецца ў тым, што сужэнствы ці сем’і сустракаюцца ў малых групах. Там яны размаўляюць аб сваіх праблемах, дзеляцца вопытам, сведчаць аб тым, што Бог учыніў у іх жыцці, што перамяніў і як яны супрацоўнічалі з Ім; заахвочваюць адно аднаго да ўзаемных намаганняў у вырашэнні праблемаў прымаюць канкрэтныя пастановы і арганізуюць супольныя дзеянні. Дапамагаюць сабе ўзаемнай малітвай.

17. Душпастырскай апекай трэба атуляць усе сем’і на працягу ўсяго іх сужэнскага жыцця. Асаблівую дапамогу трэба аказваць тым сем’ям, што церпяць ад наступстваў алкагалізму, беспрацоўя, міграцыі, нястачы, шматдзетным сем’ям. Па магчымасці, трэба ім дапамагаць і матэрыяльна праз дыяцэзіяльнае таварыства «Caritas».

18. Клапатлівай апекай трэба ахапіць сужэнствы, якія разышліся, а таксама несакрамэнтальныя сужэнствы. У адносінах да іх трэба карыстацца наступнымі прынцыпамі:

- Трэба дапамагчы тым людзям, сужэнства якіх распалася. Перад усім трэба паспрабаваць паяднаць сужэнцаў, а калі гэта не атрымаецца, трэба дапамагчы ім вытрываць у вернасці сакрамэнтальным абавязацельствам. Трэба таксама разглядзець справу юрыдычнай сепарацыі, калі існуе абгрунтаванае падазрэнне несапраўднасці сужэнства, трэба параіць і дапамагчы ў вырашэнні юрыдычна-кананічных справаў (напісанне скаргі ў касцёльны суд). Нельга забараняць сужэнцам, якія жывуць самотна, удзельнічаць у сакрамэнтальным жыцці Касцёла.
- Трэба рашуча асудзіць «свабодныя саюзы» і так званыя «пробныя сужэнствы». Годнасць чалавека патрабуе, каб сужэнскі саюз меў «сваёй мэтай любоў, якая адорвае без якіхнебудзь абмежаванняў часу або іншых абставінаў» (РС 80). Касцёл усведамляе, што такія саюзы могуць узнікаць па розных прычынах (напр., матэрыяльныя ці жыллёвыя справы), таму ў кожным выпадку трэба аргументаваць індывідуальна і выхоўваць у маладых вернасць і адказнасць, заахвочваючы іх да заключэння сакрамэнтальнага сужэнства. Ні ў якім разе нельга дапускаць такіх асобаў да сакрамэнту паяднання і Святой Камуніі (РС 81).
- Сярод грамадзянскіх сужэнстваў часта здараецца так, што адзін з сужэнцаў прагне ўзяць касцёльны шлюб, а другі рашуча выступае супраць яго. Калі ўсе сродкі заахвочвання безвыніковыя, то ў такім выпадку Касцёл дазваляе скарыстаць з прадпісанага кананічным правам «Sanatio in radice» (кан. 1161-1166).
  «Sanatio in radice» – гэта не завочнае ўдзяленне шлюбу, але юрыдычны акт, праз які дыяцэзіяльны біскуп пацвярджае законнасць заключанага сужэнства. Гэты акт уключае ў сябе дыспенсу ад перашкоды для шлюбу, калі такая перашкода існавала, а таксама дыспенсу ад кананічнай формы. Просьбу аб «Sanatio in radice» трэба накіроўваць пісьмова на Імя дыяцэзіяльнага біскупа, калі выкананы наступныя ўмовы: сужэнства было заключана публічна (у ЗАГСе), сужэнцы пражылі разам мінімум 10 гадоў, абодва сужэнцы жадаюць і далей жыць у гэтым саюзе, але адзін з іх не згаджаецца на рэлігійны абрад сакрамэнту сужэнства (фармуляр 25-28).
- Разведзеныя, якія ўступілі ў новы сужэнскі саюз. У адносінах з такімі асобамі, што жывуць у другім сужэнскім саюзе, «з любові да праўды душпастыры абавязаны правільна распазнаць

сітуацыю. Бо існуе розніца паміж тымі, хто шчыра імкнуўся ўратаваць першае сужэнства і быў несправядліва пакінуты, і тымі, хто па ўласнай, цяжкай віне знішчыў сапраўднае кананічнае сужэнства. Ёсць, урэшце, і такія, якія заключылі новы сужэнскі саюз дзеля выхавання дзяцей, часта ў сваім сумленні яны суб’ектыўна ўпэўнены, што папярэдняе сужэнства, якое знішчана незваротна, ніколі не было сапраўдным» (PC 84).
Асобы, якія жывуць у несакрамэнтальных саюзах, не могуць прыступаць да сакрамэнту паяднання і Святой Камуніі. Умовай разграшэння з’яўляецца навяртанне, г.зн. расстанне сужэнцаў. Калі ж гэта немагчыма (напр., з-за выхавання дзяцей), пры некаторых абставінах Касцёл дапускае магчымасць іх удзелу ў сакрамэнтах: менавіта, калі яны вырашаюць жыць у поўнай стрыманасці, г.зн. як «брат і сястра», і калі не будзе дрэннага ўплыву на іншых па той прычыне, што яны, жывучы без шлюбу, прымаюць Святую Камунію.

19. Кожны выпадак павінен быць дакладна даследаваны, а да маладых трэба падыходзіць з вялікай стрыманасцю і асцярожнасцю.

Святар, пакліканы да хворага, які жыве ў несакрамэнтальным саюзе і знаходзіцца ў небяспецы смерці, не павінен адмовіць у сваёй святарскай паслузе.

20. Пастырскай апекай трэба таксама атуляць людзей старых, самотных, хворых. Маладым трэба ўсведамляць, што чалавек хворы, стары таксама патрэбны і выконвае сваю ролю ў сям’і. Яго малітва, цярпенне, цярплівасць, вопыт патрэбныя сям’і. У сваю чаргу, яму патрэбна сям’я, каб ён не адчуваў сябе самотным, непатрэбным, пакінутым. Клопат аб старых, хворых і нямоглых – гэта сведчанне любові, удзячнасці, гэта найлепшая катэхеза, якую бацькі даюць сваім дзецям.

21. Дзеці з несакрамэнтальных сем’яў павінны быць атулены душпастырскай апекай і быць дапушчаны да поўнага ўдзелу ў сакрамэнтальным жыцці.

Тым, хто жыве без шлюбу, трэба дапамагчы ў ажыўленні веры, трэба заахвочваць да малітвы, да ўдзелу ў Святой Імшы, запрашаць на рэкалекцыі, набажэнствы пакаяння, на дні паяднання, заахвочваць да дабрачыннай дзейнасці. Такім чынам, трэба ім дапамагчы зразумець, што яны, хоць і не жывуць паводле Евангелля, аднак, могуць выпрасіць ласку поўнага вяртання да Хрыста.

22. Трэба дапамагаць бацькам маладых сужэнцаў, каб яны былі больш чулымі і не ўмешваліся эгаістычна ў жыццё маладых сем’яў, але каб служылі ім добразычлівасцю, малітвай і прыкладам жыцця ў згодзе. А маладыя пакаленні трэба вучыць разуменню і любові ў адносінах да старэйшага пакалення.